ОБРАЗОВАНИЕ И РАЗВИТИЕ

# История страны – через судьбы земляков



В ходе мероприятия школьники узнали о биографии своих знаменитых земляков.

**В районной центральной библиотеке имени И.А. Муравейко в рамках реализации краеведческого проекта «З краю Любанскага родам...» прошло мероприятие, посвященное 80-летию освобождения Беларуси.**

Перед учащимися Сорочской средней школы выступил Анатолий Величко – местный краевед и руководитель районного ресурсного центра устных исторических ценностей на базе вышеупомянутого учреждения образования. В самом начале мероприятия он предложил мальчишкам и девчонкам порассуждать на тему «малая родина», вспомнить знаменитых земляков и их служение на благо Отечества. Ребята быстро включились в беседу, отвечали на вопросы.

Анатолий Иосифович отметил, что Любанская земля дала стране многих замечательных людей, известных и талантливых, которые внесли весомый вклад в развитие экономики, науки и культуры. Среди них есть герои труда, военные, писатели и т.д. О биографиях некоторых из земляков всем гостям мероприятия и предложили узнать. В частности, остановились на тех, кто добывал победу в годы Великой Отечественной войны, участниках партизанского движения и фронтовиках: Николае Белькевиче, Григории Максимовиче и Василии Семеновиче.

– Мы решили выбрать эту тему, так как дети уже с начальных классов должны знакомиться с жизнью района, с его людьми, традициями, знать своих земляков и гордиться ими: ведь они учились в тех же классах, ходили теми же школьными коридорами. Из истории таких небольших городков, как наш, и складывается в итоге история всей страны, – отметили организаторы краеведческого проекта.

НІШТО НЕ ЗАБЫТА

# Жывая памяць пакаленняў

**Мінаюць дзесяцігоддзі, сціраюць успаміны. Але толькі не сціхае боль, якую перажыў наш народ падчас ліхалецця. Яна па-ранейшаму непакоіць душу, трывожыць сэрца і займае думкі жывых сведкаў, іх нашчадкаў і ўдзячных землякоў.**

Тая страшная вайна стала вялікай трагедыяй. Ворагі выбралі палітыку генацыду і масавага крывавага тэрору, яны чынілі нечуваныя зверствы супраць мірнага насельніцтва. Пацярпела ад іх і Любаншчына. У выніку карных аперацый часткова ці поўнасцю было знішчана звыш 70 населеных пунктаў. Адзін з іх – в. Савалуцк – спалены фашыстамі ў лютым 1944-га, так і не быў адноўлены.

Дзякуючы ініцыятыве ўраджэнца вёскі, доктара тэхнічных навук Аляксандра Мацвейкі, чалавека неараўнадушнага да гісторыі малой радзімы, 20 гадоў таму на месцы спаленых дамоў быў устаноўлены памятны знак. І каля яго штогод ладзяцца мітынгі-рэквіемы з удзелам прадстаўнікоў мясцовай улады, падрастаючага пакалення, грамадскасці.

Вітаючы ўдзельнікаў чарговага такога мерапрыемства, старшыня райсавета дэпутатаў Андрэй Драбудзька адзначыў:

– Хаця час усё больш аддаляе нас ад падзей Вялікай Айчыннай, але подзвігі загінулых у баях, смутак аб мільёнах бязвінных ахвяр застаюцца ў свядомасці людзей. Ды і не маем мы права забыць, які кошт заплаціла наша дзяржава і наша зямля за Вялікую перамогу.

А кошт, без перабольшвання, велізарны. Навуковы супрацоўнік музея народнай славы Антаніна Сіманава распавяла пра карныя аперацыі на тэрыторыі нашага раёна і іх наступствах.

Памяць аб ахвярах карычневай чумы прысутныя ўшанавалі мінутай маўчання, а таксама ўсклалі кветкі да памятнага знака.

**Завяршальным акордам урачыстага мітынгу стала прыняцце рабят Рэдкавіцкай адзінаццацігодкі ў піянеры і рады Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.**

«Гэта яны – будучыня краіны, наша надзея, і ім захоўваць памяць, прадаўжаць традыцыі продкаў, добрымі справамі, стваральнай працай, поспехамі славіць малую радзіму», – падкрэсліла начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Таццяна Аляксеева. А старшыня раённага савета БРПА Надзея Шаўцова пажадала навучэнцам быць годнымі грамадзянамі і нашчадкамі сваіх бабуль і дзядуль, гераічных землякоў-вызваліцеляў.


«Памяць жывая і будзе жыць», – упэўнены прадстаўнікі мясцовай улады і музея народнай славы.


Стаць піянерам ва ўрачыстай абстаноўцы – ганарова.